С.В.Зыгмантовіч, *дацэнт*

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ЯК ФОРМА ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ (на прыкладзе курса "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы")

У сучасную эпоху значна ўзрасла сацыяльная роля адукацыі: ад яе накіраванасці і эфектыўнасці сёння ў многім залежаць перспектывы развіцця чалавецтва. У апошняе дзесяцігоддзе мяняюцца адносіны да ўсіх відаў адукацыі. Адукацыя, асабліва вышэйшая, разглядаецца як галоўны, вядучы фактар сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу. Прычына такой увагі заключаецца ў разуменні таго, што найважнейшай каштоўнасцю і асноўным капіталам сучаснага грамадства з'яўляецца чалавек, здольны да пошуку і засваення новых ведаў і прыняцця нестандартных рашэнняў.

Асэнсоўваючы гэта, практычна ўсе развітыя краіны правдзілі розныя па глыбіні і маштабах рэформы нацыянальных сістэм адукацыі. Рэформы вышэйшай адукацыі набылі статус дзяржаўнай палітыкі.

Сутнасць пераўтварэнняў у вышэйшай школе нашай рэспублікі звязана не толькі з аднаўленнем арганізацыйных структур, стварэннем новых тыпаў вышэйшых навучальных устаноў, а са зменай самой парадыгмы адукацыі: пераходам ад сістэмы так званага "падтрымліваючага навучання", звернутага ў мінулае, арыентаванага на папярэдні вопыт, да сістэмы "інавацыйнага навучання", якое фарміруе ў навучэнцаў здольнасць да праектнай дэтэрмінацыі будучага, адказнасць за яго, веру ў сябе і свае прафесійныя здольнасці ўплываць на гэтую будучыню.

Згодна новай адукацыйнай парадыгме, незалежна ад спецыялізацыі і характару работы любы пачынаючы спецыяліст

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

павінен валодаць фундаментальнымі ведамі, прафесійнымі ўменнямі і навыкамі дзейнасці свайго профілю, вопытам творчай, даследчай, а таксама сацыяльна-ацэначнай работы.

Вырашэнне гэтых задач у ВНУ ажыццяўляецца праз выкарыстанне разнастайных арганізацыйных формаў навучання: лекцыі, практычныя заняткі, семінары, лабараторныя работы, практыкумы, навукова-даследчая, самастойная работа студэнтаў, вытворчая практыка, курсавыя і дыпломныя работы. У дыдактыцы гэтыя формы трактуюцца як спосабы кіравання пазнавальнай дзейнасцю навучэнцаў, ажыццяўлення ўзаемадзеяння студэнтаў і выкладчыкаў, у межах якіх рэалізуюцца змест і метады навучання. Менавіта зместам, методыкай вучэбнай дзейнасці і, што не менш значна, ступенню самастойнасці навучэнцаў адрозніваецца вышэйшая школа ад іншых формаў навучання. Выкладчык арганізуе пазнавальную дзейнасць студэнтаў. Студэнт сам ажыццяўляе пазнанне. Самастойная работа пранізвае і завяршае задачы ўсіх відаў, формаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Ніякія веды, не падмацаваныя самастойнай дзейнасцю, не могуць стаць сапраўдным здабыткам чалавека.

У сувязі з тым, што існуюць розныя азначэнні самастойнай работы ў педагагічнай літаратуры, мы будзем прытрымлівацца наступнай фармулёўкі: самастойная работа — гэта плануемая работа студэнтаў, выконваемая па заданні і пры метадычным кіраванні выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу.

Пры выкладанні курса “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы” выкарыстоўваюцца традыцыйныя формы ўласна самастойнай работы студэнтаў, якія выконваюцца імі ў зручныя для іх гадзіны пасля заняткаў. Гэта розныя віды індывідуальнай работы: самастойнае вывучэнне тэм, уключаных у план курса, якія добра забяспечаны літаратурай і па якіх не чытаюцца лекцыі; падрыхтоўка да семінараў, лабараторных работ, залікаў, экзаменаў;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў; выкананне кантрольных работ, накіраваных на авалоданне бібліяграфічнымі метадамі, працэсамі і аперацыямі бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання; правядзенне навуковага даследавання бібліяграфічнай забяспечанасці пэўных тэм і інш.

Ужо пералік формаў самастойнай работы па курсе сведчыць аб тым, што ў працэсе іх выканання спалучаецца рэалізацыя асноўных узроўняў самастойнай дзейнасці студэнтаў: рэпрадуктыўнага, рэканструктыўнага і творчага.

Рэпрадуктыўны ўзровень прадугледжвае самастойныя заданні, арыентаваныя на пазнавальную дзейнасць, звязаную з успрыманнем, пазнаннем фактаў, з'яў, іх асэнсаваннем, запамінаннем і засваеннем матэрыялу. Гэта ажыццяўляецца ў ходзе работы з канспектам лекцый, падрыхтоўкі да "лятучак" як формы рубежнага кантролю за засваеннем матэрыялу па раздзеле курса, у працэсе падрыхтоўкі да заліку і экзамену, лабараторнай работы па распрацаваным і прапанаваным алгарытме.

Да формаў самастойнай работы рэканструкцыйнага ўзроўню адносяцца заданні, накіраваныя на развіццё аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў, крытычнай ацэнкі пазнаваемых фактаў і з'яў, іх абагульненне і супастаўленне, прымяненне атрыманых ведаў для аналізу практычнага вопыту. Гэта самастойнае вывучэнне тэм, падрыхтоўка да семінараў, падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў, інфармацыйных паведамленняў па тэмах семінара аб вопыце бібліяграфічнай дзейнасці пэўных бібліятэк.

Заданні, арыентаваныя на творчую самастойную работу студэнтаў, звязаны з выкарыстаннем атрыманых уменняў і навыкаў на пошукавым узроўні і прадугледжваюць дамашнія заданні па падрыхтоўцы бібліяграфічнага паказальніка па тэме ў традыцыйнай форме; выкананне розных тыпаў запытаў з выкарыстаннем АБІС НББ; кантрольную работу, накіраваную на авалоданне метадам бібліяметрычнага аналізу пры вывучэнні

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

бібліяграфічнай забяспечанасці тэмы; рэцэнзаванне бібліяграфічных дапаможнікаў, падрыхтаваных сакурснікамі.

Спецыфіка курса "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" звязана з яго практычнай накіраванасцю. І адна з умоў эфектыўнасці пазнавальнай дзейнасці — цэласнасць, цесная сувязь формаў засваення прафесійнай дзейнасці з самой прафесійнай дзейнасцю. Таму па выкладаемым курсе існуе магчымасць пераводу часткі лабараторных работ у такую форму, як самастойная работа пад кантролем выкладчыка ва ўмовах бібліятэк або выкананне пэўнай часткі лабараторнай работы ў самастойным рэжыме ва ўмовах бібліятэкі. Так, напрыклад, арганізаваны лабараторныя заняткі па тэме "Даведачныя выданні ў даведачна-бібліяграфічным фондзе бібліятэкі", дзе вывучэнне розных відаў даведачных выданняў у традыцыйнай форме і іх эўрыстычных магчымасцей адбываецца ў працэсе лабараторнай работы, а знаёмства з электроннымі даведачнымі выданнямі ажыццяўляецца ў выглядзе самастойнай работы на падставе выкарыстання распрацаванага выкладчыкам алгарытму. Аналагічным чынам праводзіцца дзелавая гульня "Методыка падрыхтоўкі і правядзення дня бібліяграфіі": падрыхтоўка студэнтам сваёй часткі задання — адной з формаў фарміравання бібліяграфічнай культуры чытачоў бібліятэкі — адбываецца ў выглядзе самастойнай работы пасля атрымання метадычнай кансультацыі ад выкладчыка.

Пры вызначэнні формаў, відаў і зместу самастойнай работы студэнтаў па курсе ўлічваюцца многія фактары: арыентацыя на змест ведаў, наяўнасць практычных уменняў і навыкаў рашаць традыцыйныя задачы, якія выкладзены ў кваліфікацыйных характарыстыках бібліятэкараў-бібліёграфаў розных спецыялізацый, адукацыйным стандарце па спецыяльнасці; метадалагічная значнасць матэрыялу, прапанаванага для самастойнай работы студэнтаў, паглыбленне набываемых падчас аўдыторных заняткаў ведаў, уменняў і навыкаў;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

асноўныя формы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, вучэбна-метадычная забяспечанасць тых ці іншых тэм; сфарміраваныя ў студэнтаў для выканання самастойных заданняў уменні і навыкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і, безумоўна, колькасць гадзін, адведзеных на самастойную работу студэнтаў па курсе згодна вучэбнаму плану і ў адпаведнасці з вучэбнымі магчымасцямі студэнтаў.

Агульная тэндэнцыя сённяшняга педагагічнага працэсу — пераход ад рэпрадуктыўнага варыянта пазнання да прадуктыўнага (творчага), ад фактаграфічнага засваення навуковых, тэхналагічных звестак на ўзроўні запамінання (нярэдка без разумення) і ўзнаўлення па памяці (без удзелу мыслення) да фарміравання патрэбнасцей і ўменняў выкарыстоўваць навуковы змест курса як пры вырашэнні навукова-пазнавальных задач, так і будучай вытворчай дзейнасці.

Аб актуальнасці гэтай праблемы для выкладання курса сведчыць і аналіз кантролю за вынікамі самастойнай работы, іншых формаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Большасць студэнтаў не валодаюць навыкамі працы з навуковым тэкстам, не ўмеюць канспектаваць крыніцы; выклікае цяжкасці сінтэзаванне матэрыялу па пытанні, атрыманым з розных крыніц; не заўжды крытычна студэнты адносяцца да вывучаемага матэрыялу; існуюць цяжкасці з авалоданнем прафесійнай тэрміналогіяй; мала хто са студэнтаў звяртаецца за кансультацыяй да выкладчыка ў працэсе выканання заданняў па самастойнай рабоце, праяўляе ініцыятыву; большасць студэнтаў арыентуюцца на бліжэйшыя мэты — атрымаць адзнаку без разумення прафесійнай значнасці вывучаемых тэм.

Гэта сведчыць аб тым, што трэба больш увагі надаваць вывучэнню курсаў “Уводзіны ў спецыяльнасць”, “Асновы навукова-даследчай работы студэнтаў”, фарміраванню культуры вучэбнай і самастойна-пазнавальнай дзейнасці,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

развіццю пазнавальных здольнасцей студэнтаў, разуменню кожным навучэнцам ролі самастойнай работы як галоўнага сродку ў фарміраванні сапраўднага прафесіянала.

Пераход да новай педагогікі азначае і змяненне псіхалогіі выкладчыка. Выкладчык у сучасных умовах становіцца не столькі носьбітам і перадатчыкам навуковай інфармацыі, колькі арганізатарам пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, іх самастойнай работы, навуковай творчасці. Гэты тэзіс, па-першае, павінен быць асэнсаваны кожным выкладчыкам. Па-другое, аналіз падрыхтоўкі і дзейнасці выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін дае падставы для вываду, што патрабуецца значная ўвага да іх псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі, павышэння педагагічнай кваліфікацыі, засваення новых педагагічных тэхналогій. Калі прааналізаваць падрыхтоўку выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін, то яна ў большай ступені складаецца з падрыхтоўкі па спецыяльнасці, і вядучымі для сябе яны лічаць навуковыя і прагматычныя праблемы сваёй галіны. А ўласна выкладчыцкая дзейнасць, асновай якой можна лічыць вывучэнне падчас вучобы ў аспірантуры курса “Педагогіка вышэйшай школы” ў нязначным аб’ёме, складаецца з інтуітыўна-эмпірычных рашэнняў або ў ходзе засваення і капіравання прыёмаў больш вопытных калег. Так паступова метадам спроб і памылак набываецца метадычны вопыт. Склаўшаяся сістэма павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў да нядаўняга часу была арыентавана на прадметную сферу. На наш погляд, змест стажыроўкі для выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін павінен складацца з дзвюх частак: педагагічнай і прафесійна-бібліятэчнай. У нашай прафесійнай галіне не надаецца значнай увагі фарміраванню бібліятэчнай педагогікі, методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін. Яны павінны паставіць на навуковую аснову як вырашэнне праблем вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-бібліяграфічнага профілю,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

так і засваенне выкладчыкамі яе заканамернасцей, што дазволіла б перавесці выкладанне з узроўню інфармавання на ўзровень кіравання развіццём, прафесійным станаўленнем будучых спецыялістаў.

Важным кірункам удасканалення самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца дыферэнцыраванае кіраванне ёю, на што патрэбны адпаведна выдзелены час, у тым ліку ў індывідуальных планах выкладчыкаў, стварэнне пастаянных кансультацыйных пунктаў на кафедрах, рэгулярны кантроль за яе выкананнем. Менавіта тут прынцыповае значэнне маюць прафесійныя зносіны выкладчыкаў са студэнтамі.

Патрэбны распрацоўка вучэбна-метадычнага, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння працэсаў самастойнай работы студэнтаў, у тым ліку і з выкарыстаннем камп'ютэрных тэхналогій, распрацоўка сродкаў самакантролю студэнтаў за засваеннем курсаў. Хацелася б звярнуць увагу і на неабходнасць распрацоўкі выкладчыкамі метадычных парад і канкрэтных заданняў для кожнага курса з улікам спецыялізацыі і выкладаемых дысцыплін па выкананні студэнтамі такой формы самастойнай работы, як курсавыя работы.

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ